УДК 378.4(476.4)(091)

# НОВЫЯ СТАРОНКІ БІЯГРАФІІ ДЫРЭКТАРА МАГІЛЁЎСКАГА НАСТАЎНІЦКАГА ІНСТЫТУТА У.М. ТЫЧЫНІНА

Агееў Аляксандр Рыгоравіч
прафесар кафедры гісторыі Беларусі і ўсходніх славян
установы адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя А.А. Куляшова",
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
(г. Магілёў, Беларусь)

*У артыкуле коратка выкладаюцца вехі біяграфіі дырэктара Магілёўскага настаўніцкага інстытута Уладзіміра Тычыніна. Асноўная ўвага надаецца апісанню раней невядомых ці малавядомых старонак яго жыцця: вучобе ў Маскоўскай духоўнай акадэміі, даінстытуцкай працоўнай біяграфіі, дзейнасці на пасадзе дырэктара ў 1918 г.*

105 гадоў таму ў 1913 г. быў адкрыты настаўніцкі інстытут ў Магілёве. Дырэктарам інстытута быў прызначаны стацкі саветнік У.М. Тычынін, якому ўдалося за кароткі тэрмін сфарміраваць штат інстытута, стварыць яго матэрыяльную базу, арганізаваць складанне нарматыўных і метадычных дакументаў і сам навучальны працэс.

Біяграфія першага кіраўніка нашай установы паступова пазбаўляецца лагун невядомасці і набывае рысы напісанасці. Напачатку стагоддзя была апублікавана кароткая гісторыя ўстановы, у якой закранаўся першыя крокі Уладзіміра Тычыніна на пасадзе дырэктара інстытута [8, с. 9-34]. Знаходка ў Літоўскім дзяржаўным гістарычным архіве асабістай справы Тычыніна дазволіла праліць святло на некаторыя старонкі яго біяграфіі [7]. У артыкулах і працах па гісторыі педагагічнай думкі і гісторыі кафедры педагогікі былі закрануты аспекты педагагічнай дзейнасці Тычыніна і яго педагагічных поглядаў [6, с. 5-6, 44]. Знаходка ў Цэнтральным дзяржаўным архіве Масквы справы "Тычынін Уладзімір" дазволіла даведацца аб гадах вучобы ў Маскоўскай духоўнай акадэміі [9].

Нарадзіўся будучы дырэктар інстытута згодна фармулярнаму спісу у Арлоўскай губерні ў 1862 г. Па заканчэнні курса Арлоўскай духоўнай семінарыі ў 1883 г. Уладзімір Тычынін пачаў сваю працу ў 1883 г. у Прадцечаўскай земскай школе Арлоўскай губерні. Працаваў ён настаўнікам крыху больш за год па 26 верасня 1884 г. Затым малады настаўнік працягнуў сваю адукацыю ў знакамітай Маскоўскай духоўнай акадэміі. Акадэмія забяспечыла грунтоўнасць яго адукацыі [3, л. 138-139].

Справа студэнта Акадэміі пачынаецца з пасведчання ад земскага доктара першага ўчастка Елецкага ўезда ад 31 жніўня 1885 г. аб тым, што студэнт другога курса Уладзімір Мікалаевіч Тычынін 23-х гадоў захварэў на блукаючы рэўматызм і не можа да яго выздараўлення з'явіцца ў Акадэмію ў прызначаны тэрмін. Да гэтага прыкладалась і ўласнае заяўленне Тычыніна аб хваробе на імя інспектара Акадэміі Паўла Іванавіча Горскага. Наступны дакумент сведчыць аб хваробе студэнта ў лютым 1886 г. цяпер на запаленне плеўры [9, л. 1-3]. Дакументы могуць сведчыць аб слабым здароўі Тычыніна, але дзіўным чынам яны кожны раз выдаваліся напрыканцы заканчэння студэнцкіх канікул адным і тым жа земскім ўрачом.

У Савет Маскоўскай духоўнай акадэміі 20 жніўня 1888 г. студэнт чацвёртага курса Тычынін напісаў заяву, у якой выказаў жаданне служыць па духоўнаму ведамству, у тым ліку гатоўнасць на названую службу і ў Сібірскіх губернях [9, л. 4].

Найбольш каштоўным дакументам справы з'яўляецца Дыплом, які засведчыў, што студэнт за 4 гады выслухаў поўны курс навук агульнаабавязковых і спецыяльных. З дакумента вынікае, што большасць адзнак Тычыніна была "вельмі добра" або "дужа добра". Так адзначаны яго веды па 13 агульнаабавязковых і 4 спецыяльных прадметах. Толькі па трох агульнаабавязковых прадметах веды ацэнены на "добра": "агульнай царкоўнай гісторыі", "царкоўнай археалогіі і літургіке" і па "гісторыі філасофіі". Таксама на "добра" былі ацэнены веды па нямецкай мове. За атрыманыя веды Тычынін быў уганараваны 20 лістапада 1888 г. звання кандыдата багаслоўя, і яму быў выдаддзены дыплом [9, л. 5]. Яшчэ некалькі дакументаў вырашалі фінансавыя справы і прызначэнне выпускніка ў Арлоўскае епархіяльнае жаночае вучылішча.

Па заканчэнні курса акадэміі ў 1888 г. Уладзімір Мікалаевіч у 1889 г. паступіў на службу выкладчыкам славеснасці і грамадзянскай гісторыі Арлоўскага епархіяльнага жаночага вучылішча. Адпрацаваўшы два з паловай гады ў жаночай навучальнай установе, ён развітаўся з роднай Арлоўшчынай і ў 1891 г. пераехаў на беларускія землі. Тут ён быў прызначаны настаўнікам лацінскай мовы ў Віцебскае мужчынскае духоўнае вучылішча [3, л. 138–140]. Толькі стаўшы на ногі Уладзімір Мікалаевіч змог дазволіць сабе 29 чэрвеня 1892 г. ажаніцца з Любоўю Фёдараўнай Паповай, 1865 г. нараджэння, праваслаўнага веравызнання [7, л. 23].

У 1895–1997 гг. Тычынін выкладаў таксама ў Полацкім жаночым духоўным вучылішчы, якое размяшчалася ў Віцебску. У пачатку 1897 г. Тычынін быў прызначаны наглядчыкам Віцебскага духоўнага вучылішча. Паралельна дырэктар выкладаў мовы ды іншыя прадметы, актыўна працаваў у епархіяльных органах. Ён быў членам і справаводам з 1893 па 1898 гг. Віцебскага аддзялення Полацкага епархіяльнага вучылішчнага савета, членам яго школьнага камітэта з 1903 г., членам камісіі па пабудове будынка Полацкага жаночага духоўнага вучылішча і г.д. [3, л. 139-140].

Адначасова Тычынін вёў актыўную грамадскую дзейнасць. Ён абіраўся і зацвярджаўся членам саветаў і рэвізійных камісій разнастайных грамадскіх арганізацый. Актыўна ўдзельнічаў Уладзімір Мікалаевіч і ў дзейнасці Імператарскага праваслаўнага палесцінскага таварыства [7, л. 22-29]. Праверкі паказвалі ўзорны стан спраў у Віцебскім духоўным вучылішчы. Невыпадкова ў 1911 г. яго прызначылі дырэктарам Свіслацкай семінарыі.

Паступова ён стаў вядомым на Беларусі педагогам, рэгулярна друкаваўся ў газетах, педагагічных часопісах, лічыўся прадстаўніком «прагрэсіўнай педагогікі». За ўзорную службу Тычынін меў шматлікія падзякі і ўзнагароды. Цалкам заканамерным у святле знойдзенных намі і апісаных фактаў біяграфіі У.М. Тычыніна з'яўляецца яго прызначэнне на пасаду дырэктара Магілёўскага настаўніцкага інстытута.

Дырэктар Віцебскага настаўніцкага інстытута К.І. Ціхаміраў аказваў метадычную і практычную дапамогу свайму магілёўскаму калегу, чаму спрыялі іх добрыя адносіны і сумесная дзейнасць у Віцебску, у якім Тычынін адпрацаваў 20 гадоў [3]. Паспяховая дзейнасць Уладзіміра Мікалаевіча Тычыніна на пасадзе дырэктара настаўніцкага інтстытута была намі апісана ў папярэдніх публікацыях [8]. А вось апошнія 1917–1918 гг. яго кіраўніцтва інстытутам былі намі толькі канспектыўна пазначаны.

Недаследаванасць падзей 1918 г. мае аб'ектыўную аснову – амаль поўную адсутнасць наяўных крыніц. Прыемным і ўнікальным выключэннем з'яўляецца справа № 45 – "Журнал исходящих бумаг Могилевского учительского института" ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі [5]. Публікацыя намі запісаў журнала даказала, што, дзякуючы самаадданай працы дырэктара Тычыніна і супрацоўнікаў інстытута, установа не прыпыніла сваёй дзейнасці ў 1918 годзе. Інстытут працягваў працаваць, нягледзячы на тое, што ў сакавіку горад быў заняты польскімі ўзброенымі фарміраваннямі, якіх у маі замянілі германскія войскі. З запісаў бачна дастаткова інтэнсіўная перапіска Тычыніна з навучэнцамі і прасіцелямі, іншымі ўстановамі, у тым ліку навучальнымі. Маюцца адказы на звароты прасіцеляў, лісты з умовамі прыёму ў інстытут, спісы выпускнікоў, выпіскі з пратаколаў педагагічнага савета з рашэннямі аб прашэннях настаўнікаў, з умовамі здачы экзамену на званне настаўніка вышэйшых пачатковых вучылішч і г.д.

Пасля рэвалюцыі не надта добра складаліся ўмовы жыцця дырэктара. У маі 1918 г. абрабавалі кватэру Тычыніна. У выніку цяжкай працы па пачатку навучальнага года Тычынін вымушаны быў 12 кастрычніка прасіць Упраўляючага навучальнай



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

акругі прадаставіць адпачынак “па хваробе” з прыкладаннем копіі пратакола педагагічнага савета за № 33 гэтага ж дня. Пасведчанне на двухмесячны адпачынак з 1 лістапада па 1 студзеня 1919 г. па хваробе было выдадзена яму 20 кастрычніка [5, л. 50, 64-64 аб.].

Былы дырэктар Магілёўскага настаўніцкага інстытута, былы стацкі саветнік У.М. Тычынін працягваў чытаць лекцыі студэнтам у навучальнай установе, якая напачатку называлась педагагічным, з 1919 г. – Інстытутам народнай адукацыі, а з 1921 г. – Практычным інстытутам народнай адукацыі. Надалей яшчэ была праца ў Магілёўскім педагагічным тэхнікуме.

Роўна 100 гадоў таму скончыўся адведзены лёсам тэрмін кіравання Магілёўскім настаўніцкім інстытутам Уладзіміра Тычыніна. Папрацаваўшы пяць гадоў дырэктарам ён перайшоў на пасаду выкладчыка інстытута. Для таго каб дапісаць біяграфію ставаральніка інстытута, нам не хапае толькі звестак пра апошнія гады яго жыцця.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Агееў, А. Р. 1918-ы год у гісторыі МДУ імя А. А. Куляшова. Да 105-годдзя з пачатку гісторыі МДУ імя А.А. Куляшова / А. Р. Агееў // Веснік Магілёўскага дзярж. ун-та імя А. А. Куляшова. Серыя А. Гум. навукі. Гісторыя. Філасофія. Філалогія. – 2018. – № 2 (52). – С. 4–12.
2. Агееў, А. Р. Першыя выкладчыкі і настаўнікі ў гісторыі Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова // Веснік МДУ імя А.А. Куляшова. – 2003. – № 4. – С. 241–248.
3. Агееў, А. Р. Праца першага дырэктара Магілёўскага настаўніцкага інстытута У.М. Тычыніна ва ўстановах духоўнага ведамства / А. Р. Агееў // Религия и общество – 7 : сб. науч. статей / под общ. ред. В. В. Старостенко, О. В. Дьяченко. – Могилев : УО «МГУ им. А. А. Кулешова», 2012. – С. 138–140.
4. Агееў, А. Р. Спаборніцтва і супрацоўніцтва Віцебска і Магілёва ў працэсе стварэння настаўніцкіх інстытутаў у пачатку ХХ стагоддзя / А. Р. Агееў // Ученые записки УО «ВГУ имени П. М. Машерова» : сборник научных трудов. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2015. – Т. 19. – С. 5-12.
5. Журнал исходящих бумаг Могилевского учительского института // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 2258. Воп.1. Спр. 45.
6. Кафедра педагогики МГУ имени А. А. Кулешова. От истоков до современности (1913–2013) : биобиблиографический справочник / авт.-сост.: С. Н. Новикова, Е. И. Снопкова, С. В. Спирин. – Могилев : МГУ имени А.А. Кулешова, 2013. – 132 с. : ил.
7. Личное дело Тычинина // Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. 567. Воп. 17. Спр. 987.
8. Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.А. Куляшова: мінулае і сучаснасць / аўт.-склад.: А. Р. Агееў [і інш.]. – Магілёў : МДУ імя А.А. Куляшова, 2003. – 259 с. : іл.
9. Тычинин Владимир // Центральный государственный архив города Москвы. Ф. 229. Воп. 4. Спр. 4452.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова